
IDW
#10 • $3.99 • CVR A
TEENAGE MUTANT NINJA
TURTLES
EASTMAN
WALTZ
DUNCAN
PATTISON
ПАДЛЕТКІ МУТАНТЫ
ЧАРАПАШКІ-НІНЗЯ
#10 (2011)


IDW
#10 • $3.99 • CVR B
TEENAGE MUTANT NINJA
TURTLES
EASTMAN
WALTZ
DUNCAN
PATTISON
BY comics
ПАДЛЕТКІ МУТАНТЫ
ЧАРАПАШКІ-НІНЗЯ
#10 (2011)
EASTMAN '12



IDW
#10 • CVR RI
TEENAGE MUTANT NINJA
TURTLES
EASTMAN
WALTZ
DUNCAN
PATTISON
BY COMICS
ПАДЛЕТКІ МУТАНТЫ
ЧАРАПАШКІ-НІНЗЯ
#10 (2011)


З ТАГО МОМАНТУ, ЯК Я ЎСВЯДОМІЎ, ШТО АПЫНУЎСЯ Ў ЦЕЛЕ ПАЦУКА, Я АДЧУЎ ПРЫСУТНАСЦЬ НЕЙКАГА СТАРАЖЫТНАГА І ЗМРОЧНАГА ЦЕНЯ, НАВІСШАГА НАДА МНОЙ – СІЛУЭТУ НЕВЫРАЗНАГА, АЛЕ ПРЫ ГЭТЫМ ДА БОЛЮ ЗНАЁМАГА.
Я АДЧУВАЎ, ЯК ГЭТЫ ЦЕНЬ ЦЯГНЕ ДА МЯНЕ СВАЕ ЗМРОЧНЫЯ ШЧУПАЛЬЦЫ, СПРАБУЕ СХАПІЦЬ МЯНЕ... І МАЮ СЯМ'Ю.
ЭЛЕ ГЭТЫ ВОРАГ – ТОЙ САМЫ ЦЕНЬ – УСПЛЫВАЎ ПЕРАД НАМІ ТОЛЬКІ Ў ВЫГЛЯДЗЕ НЕВЫРАЗНЫХ ВЫБЛІСКАЎ І РАЗМЫТЫХ НАМЁКАЎ.
ДА ГЭТАГА ЧАСУ.
Я КАРАІ З КЛАНУ «ФУТ», ГРЫЗУН. А ГЭТА...
ЯК Я І МЕРКАВАЎ, ЯГО ІМЯ АКАЗАЛАСЯ МЕНАВІТА ТЫМ, ШТО БЫЛО ЗНАЁМА МНЕ НА ПРАЦЯГУ ВОСЬ УЖО ЦЭЛЫХ ДВУХ ЖЫЦЦЯЎ. АЛЕ, ЯК І Ў ВЫПАДКУ З АСТАТНІМІ, У ДРУГІМ ЖЫЦЦІ...
...У ЯГО АКАЗАЎСЯ НОВЫ, ЖУДАСНЫ ТВАР.
...МАЙСТАР ШРЭДАР!



«ФУТ» ІСНУЕ ЎЖО ШМАТ СТАГОДДЗЯЎ, ПАЦУК. ХАВАЮЧЫСЯ Ў ЦЕМРЫ. МЫ УВЕСЬ ЧАС ЗАСТАЁМ НАШЫХ ВОРАГАЎ ЗНЯНАЦКУ, ЗНІШЧАЕМ ІХ І ЗНІКАЕМ У НАЧЫ, ЧАКАЮЧЫ НОВАГА ЗАГАДА НАШАГА МАЙСТРА.
МЫ ЗАБОЙЦЫ. МЫ РАБАЎНІКІ. МЫ ВАЯРЫ.
МЫ НІНЗЯ.
Я ВЕДАЮ, ХТО ВЫ ТАКІЯ.
НЯЎЖО?



ТАДЫ ТЫ, НАПЭЎНА, ВЕДАЕШ, ЧАМУ ТЫ ТУТ?
ХУТКА БУДЗЕ ВАЙНА, ГРЫЗУН. ПАЧНЕЦЦА ЯНА НА БРУДКІХ ВУЛІЦАХ ГЭТАГА ГОРАДА І ПАСТУПОВА РАСПАЎСЮДЗІЦЦА НА ЎСІМ ЗЯМНЫМ ШАРЫ. ВАЙНА ЗА ЎЛАДУ І КАНТРОЛЬ. ВАЙНА, ЯКУЮ «ФУТ» ПЛАНАВАЛІ СТАГОДДЗЯМІ.
І ПАД КІРАЎНІЦТВАМ МАЙСТРА ШРЭДАРА...
...КЛАН «ФУТ» АТРЫМАЕ ПЕРАМОГУ Ў ГЭТАЙ ВАЙНЕ.
І ЯКОЕ ДАЧЫНЕННЕ ГЭТАЯ ВАЙНА МАЕ ДА МЯНЕ?
КЛАН «ФУТ» СКЛАДАЕЦЦА З САМЫХ НАТРЭНІРАВАНЫХ, ДЫСЦЫПЛІНАВАНЫХ І СМЕРТАНОСНЫХ САЛДАТ НА ПЛАНЕЦЕ. АЛЕ МЫ НІКОЛІ НЕ СПЫНЯЕМСЯ НА ДАСЯГНУТЫМ.
НАША ГАЛОЎНАЯ СІЛА СКЛАДАЕЦЦА З НАШАЙ ЗДОЛЬНАСЦІ АДАПТАВАЦЦА І ДАМІНАВАЦЬ.


ТЫ – ЖЫВОЕ ПАЦВЕРДЖАННЕ ТАГО, ШТО НАШЫ ВОРАГІ СТАЛІ ПАПАЎНЯЦЬ СВАЕ АРМІІ ВАЯРАМІ-МУТАНТАМІ З НЕАРДЫНАРНЫМІ ЗДОЛЬНАСЦЯМІ...
...ШТО ЗРАБІЛІ І МЫ.
ТЫ НЕ АДКАЗАЛА НА МАЁ ПЫТАННЕ: ЯК ГЭТА ТЫЧЫЦЦА МЯНЕ?
СЁННЯ МЫ ДАЕМ ТАБЕ МАГЧЫМАСЦЬ ДАЛУЧЫЦЦА ДА НАШАЙ АРМІІ, МУТАНТ. СТАЦЬ САЛДАТАМ КЛАНА «ФУТ».
АЛЕ СПАЧАТКУ...
...ВЫПРАБА-ВАННЕ!


АБАРАНЯЙСЯ, ГРЫЗУН...
...АБО ЗАГІНЬ.


GAS
REGULAR 4.15
PREMIUM 4.25
SUPER 4.35
MARKET
РАБЯТЫ, НАМ ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗАТРЫМАЦЦА КАЛЯ ГЭТАЙ ЗАПРАЎКІ...
МЫ ЎЖО ЦЭЛУЮ ГАДЗІНУ РУХАЕМСЯ ТУДЫ-СЮДЫ, І Я ЗАРАЗ КОНЧУСЯ.
Я ТАКСАМА, ЭЙПРЫЛ. ПАСЛЯ БОЙКІ З КУЧАЙ РОБАТАЎ У КАНАЛІЗАЦЫІ, А ПОТЫМ У ЛАБАРАТОРЫЯХ Я ТАК ЗМАРНАВАЎСЯ, АЖ ПАНЦЫР БАЛІЦЬ.
ГЭТА ЯНА ПРА ФУРГОН КАЖА, ПРЫТЫРАК.
І ЯНА МАЕ РАЦЫЮ – УСЁ ГЭТА МАРНА. МЫ ПАВІННЫ СПЫНІЦЦА І ПАДУМАЦЬ, ШТО РАБІЦЬ ДАЛЕЙ.
ДА ШТО ТУТ ДУМАЦЬ? НЕЙКІЯ НАХАБНЫЯ НІНЗЯ ВЫКРАЛІ СПЛІНТЭРА, І ЗАРАЗ МЫ ПАВІННЫ ЯГО ВЯРНУЦЬ.
КЛАН «ФУТ».
ШО?
ТЫЯ, ХТО ВЫКРАЎ БАЦЬКУ – НАПЭЎНА ГЭТА КЛАН «ФУТ». УСЁ ЗЫХОДЗІЦЦА...
...УСЁ, ПРА ШТО НАМ РАСКАЗВАЎ СПЛІНТЭР, УСЁ ГЭТА МАЕ СЭНС. АРОКУ САКІ, НАША РЭІНКАРНАЦЫЯ, РОБАТЫ, І НАВАТ СТОКМАН І ГЭТЫ ІДЫЁТ НЯЧЫСЦІК – УСЁ ГЭТА ВЯДЗЕ НАС ДА КЛАНА «ФУТ»... НАШЫХ СТАРАЖЫТНЫХ СУПРНІКАЎ...
...ЯК І КАЗАЎ БАЦЬКА.


ГЭЙ... НЕ ПАЧЫНАЙ ЗНОЎ ГЭТАЕ КАСМІЧНАЕ ТРЫЗНЕННЕ, ЛЕА. ЗАРАЗ НАМ ПАТРЭБЕН ДОБРА ПРАДУМАНЫ, ЦВЯРОЗЫ ПЛАН, А НЕ ТВАЯ ЗВЫШНАТУРАЛЬНАЯ БАЛБЫТНЯ.
ДОНІ, ЧАМУ Б ТАБЕ ХОЦЬ РАЗ У ЖЫЦЦІ НЕ ПЕРАКРОЧЫЦЬ ПРАЗ СВАЮ АБМЕЖАВАНАСЦЬ І ПААЗІРАЦЦА?
І ШТО Я ЎБАЧУ, ЛЕА? ПАЛЮЮЧЫХ НА НАС НІНЗЯ, ЯКІМ УЖО НЕКАЛЬКІ СТАГОДДЗЯЎ? МОЖА, ТЫ МНЕ НА ІХ ПАЛЬЦАМ ТКНЕШ, БО Я ІХ НЕШТА НЕ НАЗІРАЮ.
ЧОРТ БЯРЫ, ДОНІ! ТЫ Ж САМ БАЧЫЎ «ФУТ»! ПРАКЛЁН НА МАЮ ГАЛАВУ, ДЫ Я ЗМАГАЎСЯ З ІМІ!
ТЫ ЗМАГАЎСЯ З НІНЗЯ, ЯКІХ ПАЛІЧЫЎ КЛАНАМ «ФУТ», ЛЕА. І ГЭТА ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО БАЦЬКА ЗАРАЗІЎ ГЭТАЙ ІДЭЯЙ ТВАЮ ЧАРАПУШКУ. ЦЯПЕР ТЫ РАПТАМ ВЫРАШЫЎ, ШТО МЕНАВІТА ЯНЫ ЯГО І ВЫКРАЛІ, ХОЦЬ І НЯМА НІЯКІХ ДОКАЗАЎ.
ПАМЯТАЕШ МАЮ БОЙКУ СА СТОКМАНАМ І ЯГО ПАСЛУГАЧАМІ, З УСІМІ ГЭТЫМІ ПРЫБОРАМІ? А МАЙКІ МЕЎ СПРАВУ З НЕЙКІМІ АБІБОСАМІ, ЯКІЯ СПРАБАВАЛІ ВЫКРАСЦЬ РАДЫЁАКТЫЎНЫЯ МАТЭР'ЯЛЫ...
І ЗАЛЯТАЎСЯ ДА ВЕЛЬМІ ФАЙНАЙ ДЗЯЎЧЫНЫ Ў ГАРНІТУРЫ КОШКІ!
А РАФ СУТЫКНУЎСЯ З НЕЙКАЙ ПАЛЯРНАЙ ЛІСКАЙ-МУТАНТАМ?*
*ГЛ. TMNT: МІКРА-СЕРЫІ #1-4
КАНЕШНЕ, ПАМЯТАЮ. ДЛЯ ЧАГО ТЫ ГЭТА ЎЗГАДАЎ, ДАНАТЭЛА?
ГЭТА Я ДА ТАГО, ЛЕАНАРДА, ШТО ТРЫ З ЧАТЫРОХ НАШЫХ СУСТРЭЧ НЕ МЕЛІ НІЯКІХ АДНОСІН НІ ДА ЧАГО ЗВЫШНАТУРАЛЬНАГА. ГЭТА 75 АДСОТКАЎ, МУЖЫК. І ЯШЧЭ АДЗІН МОМАНТ, НЕ ЗАБУДЗЬ ПРА СЁННЯШНЮЮ ВЕЧАРЫНУ З РОБАТАМІ!
УСЯ ГЭТАЯ АГУЛЬНАЯ ЗМОВА МАЕ НАВУКОВАЕ ТЛУМАЧЭННЕ, І ТЫ Б ЗАЎВАЖЫЎ ГЭТА, КАЛІ Б НАДАЎ ПАРУ ХВІЛІН НА АНАЛІЗ СІТУАЦЫІ, ЯК НАЛЕЖЫЦЬ САПРАЎДНАМУ ЛІДАРУ.


АДЗІНАЕ, ШТО Я ЗАЎВАЖЫЎ, ДЫК ГЭТА ВАС АБОДВУХ, МАРНУЮЧЫХ КАШТОЎНЫ ЧАС НА ПУСТЫЯ РАЗМОВЫ. СПЛІНТЭР У НЕБЯСПЕЦЫ, І МЫ ПАВІННЫ ЯГО ВЫРАТАВАЦЬ. Я НЕ ЗБІРАЮСЯ ГУБЛЯЦЬ БАЦЬКУ З-ЗА ТАГО, ШТО ВЫ НІЯК НЕ ВЫРАШЫЦЕ, ХТО З ВАС САМЫ КРУТЫ.
РАФАЭЛЬ, ЦЯБЕ НЕ ПЫТАЛІ.
ТАК, РАФ, ГЭТА ЦЯБЕ НЕ ТЫЧЫЦЦА.
ЯНЫ ЗАЎСЁДЫ ТАКІЯ?
ОЙ, ШТО ТЫ. ГЭТА ЯШЧЭ КВЕТАЧКІ.
ВОСЬ ЯК! НУ А ЦЯБЕ ГЭТА БУДЗЕ ТЫЧЫЦЦА, КАЛІ Я ЗАРАЗ ПАСТУКАЮ ПА ТВАЁЙ ГАЛАВЕ, ДОН!
ДЫ Ў ЦЯБЕ ДУХУ НА ТАКОЕ НЕ ХОПІЦЬ!
СУПАКОЙСЯ, РАФ.
ХЛОПЦЫ, ХЛОПЦЫ...
...ХЛОПЦЫ!
ВАМ УСІМ ТРЭБА СУПАКОІЦЦА. МА ЗГУБІЛІ БАЦЬКУ, ДОМ, УСЕ НАШЫ РЭЧЫ, НАМ НЕЧАГА НАВАТ ПАЕСЦІ, А ВЫ ТУТ КУСАЕЦЕСЯ АДЗІН З АДНЫМ. ГЭТА ПОЎНАЕ ЛАЙНО.
ЗАМЕСТ ГЭТАГА, ДАВАЙЦЕ ЛЕПШ ВЫРАШЫМ, КУДЫ РУХАЦЦА ДАЛЕЙ.
ДУМАЮ, Я ВЕДАЮ, КУДЫ МЫ МОЖАМ ПАЕХАЦЬ...
...КАЛІ, КАНЕШНЕ, ВЫ НЕ ВЫРАШЫЦЕ ПРАЦЯГНУЦЬ СВАЕ ІНФАНТЫЛЬНЫЯ ПЕЎНЕВЫЯ БАІ І ПРАСІДЗЕЦЬ У ФУРГОНЕ ЎСЮ НОЧ?
ШТО СКАЖАЦЕ?


Я НЕ ХАЧУ ПРЫМАЦЬ УДЗЕЛ У ГЭТАЙ БІТВЕ.
ХІЙЯ!
КАЛІ Ж Я АТРЫМАЮ ПЕРАМОГУ, ГЭТА БУДЗЕ НАСУПЕРАК МАІМ МІРНЫМ ПРЫНЦЫПАМ.


ТЫМ НЕ МЕНШ, ЗДАВАЦЦА...
ХІЙЯЯ!
УФ!
...Я ЗУСІМ НЕ ЗБІРАЮСЯ.
МАЕ ВЫКРАДАЛЬНІКІ ЛІЧАЦЬ, ШТО Ў ІМ ЁСЦЬ ПЕРАВАГА ПЕРАДА МНОЙ – ЭЛЕМЕНТ НЕЧАКАНАСЦІ.
НАЎРАД ЦІ ЯНЫ ЎСВЕДАМЛЯЮЦЬ, ШТО Я ЦЫЛАЕ ЖЫЦЦЁ ЗМАГАЎСЯ СПІНА ДА СПІНЫ З КЛАНАМ «ФУТ», А ПОТЫМ СУПРАЦЬ ІХ.


ІХ БАЯВЫ СТЫЛЬ – ГЭТА МАЯ ДРУГАЯ НАТУРА. УСЕ ІХ РУХІ І ТЭХНІКІ МНЕ ЗНАЁМЫ.
І НЯХАЙ У ГЭТЫМ НОВЫМ ЖЫЦЦІ ІХ ІМЁНЫ І ТВАРЫ МАГЛІ ЗМЯНІЦЦА...
...ІХ МЕТАДЫ, ВІДАВОЧНА, ЗАСТАЛІСЯ НЯЗМЕННЫМІ.
АД СТАРЫХ ЗВЫЧАК, ЯК КАЖУЦЬ...
...ЦЯЖКА ПАЗБАВІЦЦА.



І, ЯК ГАВОРЫЦЦА Ў ПРЫКАЗЦЫ, ЧЫМ ЯНЫ БОЛЬШ...
...ТЫМ БАЛЬНЕЙ ІМ ПАДАЦЬ.
ЧАГО ТЫ ЧАКАЕШ, МУТАНТ? ЗАБІ...
...ЦІ ЗАБ'ЮЦЬ ЦЯБЕ!


Я ЦЯБЕ ЗАРАЗ УМАРНУЮ!
ТЫ КАЗАЎ, ШТО ПАЦУК ПАД НАДЗЕЙНАЙ АХОВАЙ. СЦВЯРДЖАЎ, ШТО ЯНА НІКУДЫ НЕ РУШЫЦЦА. ЧАМУСЬЦІ, МІСТАР НЯЧЫСЦІК, Я НЕ НАЗІРАЮ ТУТ НІЯКАГА ПАЦУКА: НІ МУТАНТА, НІ САМАГА ЗВЫЧАЙНАГА ГРЫЗУНА.
ЯК ТЫ МОГ ТАКОЕ ДАПУСЦІЦЬ, ЧОРТАВА ТЫ ПАМЫЛКА ПРЫРОДЫ!?
ДОСЫЦЬ ГАРЛАНІЦЬ, А? І БЕЗ ТАГО ГАЛАВА РАС-КОЛВАЕЦЦА.
БУДЗЬ УДЗЯЧНЫ, ШТО ТВАЯ ГАЛАВА ЯШЧЭ НА ПЛЯЧАХ!
ТЫ ТАКСАМА СКАЖАШ «ДЗЯКУЙ», КАЛІ ПЕРАСТАНЕШ ТЫКАЦЬ У МАЮ ПЫСУ ПАЛЬЦАМ, І Я ЯГО НЕ АДАРВУ.
ВЕДАЕШ, СТОКМАН, ВЕЛЬМІ ДЗІЎНА, ШТО Ў ПАЦУКА АТРЫМАЛАСЯ ЗБЕГЦІ, УЛІЧВАЮЧЫ ЖОРСТКУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ СЯРОД ТВАІХ ПАДНАЧАЛЕНЫХ.


КАЛІ ЛАСКА, ГЕНЕРАЛ... ВЫШЫЯ САРКАСТЫЧНЫЯ ПАЗНАКІ ЗАРАЗ НЕ ДАПАМОГУЦЬ. Я САМ.
ЯШЧЭ РАЗ. ШТО ЗДАРЫЛАСЯ З ПАЦУКОМ, МІСТАР НЯЧЫСЦІК?
МІСТАРА АЛЕНА?
ТЫ МЯНЕ ПЫТАЕШ? КАЖУ Ж, Я БЫЎ БЕЗ СВЯДОМАСЦІ.
СПЫТАЙ ГЭТАТА СЛАБАКА ЧЭТА – ЁН УСЁ БАЧЫЎ.
КУДЫ ЗНІК ГЭТЫ ІДЫЁТ?
МІСТАР АЛЕН!
С-СЛУХАЙ... НЕ МАГУ ДОЎГА ГАВАРЫЦЬ. К-КАЛІ ЛАСКА, ПЕРАДАЙ МАЙСТРУ, ШТО, ЭЭ, ЧАРАПАХІ З'ЯВІЛІСЯ...
...АД-ДРАЗУ ПАСЛЯ ТАГО, ЯК КАРАІ ЗАБРАЛА ПАЦУКА.


ANTIQUES
THE SECOND TIME AROUND SHOP! S
ПРАБАЧЦЕ, МЫ ЗАЧЫНЕНЫЯ
ВОСЬ ЯНО.
НУ... ГЭТА ЛЕПШ, ЧЫМ НІЧОГА.
А НЯЎЖО Я СКАЗАЛА, ШТО МЫ ЕДЗЕМ У ГАТЭЛЬ КЛАСА ЛЮКС?
БУДЫНАК ШМАТ ГАДОЎ НАЛЕЖЫЛА МАЁЙ СЯМ'І. МОЙ БАЦЬКА ЗБІРАЎСЯ АДНАЎЛЯЦЬ ЯГО, АЛЕ Ў ЯГО ЗДАРЫЎСЯ САРДЭЧНЫ ПРЫСТУП. ТАМУ ЁН ЎЖО НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ СТАІЦЬ У ЗАКІНУТЫМ СТАНЕ.
А ТАМ ЁСЦЬ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ І ЭЛЕКТРА-ЗАБЕСПЯЧЭННЕ?
АГА, МАЕ БАЦЬКІ ПРАЦЯГВАЮЦЬ АПЛОЧВАЦЬ РАХУНКІ.
НАВЕРСЕ ТАКСАМА ЁСЦЬ НЕКАЛЬКІ ВОЛЬНЫХ КВАТЭР, АДНАК ТАМ, ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ, НЯМА МЭБЛІ.
НАМ УСЁ РОЎНА – МЫ ТУТ НА КАРОТКІ ЧАС. НАМ ТОЛЬКІ ТРЭБА АДПАЧНУЦЬ І РАСПРАЦАВАЦЬ ПЛАН.
Я МАГУ ЎЗЛАМАЦЬ ВАКНО СВАІМ САЕМ.
А МОЖНА ПРОСТА АДЧЫНІЦЬ ДЗВЕРЫ МАІМ КЛЮЧОМ.
ЭХ, ВЫ, НІНЗЯ.


Я ЎЖО ДУМАЛА САМАСТОЙНА ТУТ ПРЫБРАЦЦА, АЛЕ З-ЗА ШКОЛЫ І ІНТЭРНАТУРЫ Ў МЯНЕ ЗУСІМ НЕ БЫЛО ВОЛЬНАГА ЧАСУ.
ЯК Я І КАЗАЛА, ГЭТА НЕ САМАЕ КАМФОРТНАЕ МЕСЦА, АЛЕ, ПА МЕНШАЙ МЕРЫ, ТУТ ВЫ БУДЗЕЦЕ СХАВАНЫ АД ЧУЖЫХ ВАЧЭЙ, А ВАМ ТРЭБА МЕНАВІТА ГЭТА, ТАК?
ЗАРАЗ Я ЗАПАЛЮ СВЯТЛО.
ТА ДА!
УАЎ!
ГЭТА Ж...
...ФАЙНА!
ЭЛЕКТРОНІКА
КОМІКСЫ
КОМІКСЫ


УХ ТЫ! ПЕРШЫ НУМАР «СРЭБНАГА ВАРТАВОГА» Ў ВЫДАТНЫМ СТАНЕ!
ВАКУУМНАЯ ЛЯМПА! ЦУД!
ВІДАЦЬ, ДОНУ І МАЙКІ ТУТ ПАДАБАЕЦЦА.
АГА. ДВА БАТАНІКА Ў АДНОЙ АБОЙМЕ.
ЭЙПРЫЛ, МЫ ВЕЛЬМІ ЎДЗЯЧНЫ ЗА ТОЕ, ШТО ТЫ ЗНАЙШЛА НАМ ПРЫТУЛАК. ТЫ САПРАЎДЫ ТАК ДАПАМАГАЕШ НАМ – НАВАТ НЕ ВЕДАЮ, ЯК МЫ ЗМОЖАМ ТАБЕ АДПЛАЦІЦЬ.
НЕ ХВАЛЮЙСЯ НА КОНТ ГЭТАГА. Я Ж СКАЗАЛА, ГЭТА ЎЗАЕМНАЯ КАРЫСЦЬ...
ДАПАМАГАЮЧЫ ВАМ, ХЛОПЦЫ, Я АДЧУВАЮ, ШТО ГЭТА, НАРЭШЦЕ, ДАПАМАГАЕ МНЕ. НАЖАЛЬ, Я НЕ ВЕДАЮ, ЯК ДАПАМАГЧЫ ВАМ У ПОШУКАХ БАЦЬКІ.
НЕ ТУРБУЙСЯ...
...З ГЭТЫМ МЫ НЕШТА ПРЫДУМАЕМ.
РАФ ПРАВЫ. АЛЕ СПАЧАТКУ НАМ ТРЭБА ПАСПАЦЬ І ПАЕСЦІ. У НАС БЫЛА ЦЯЖКАЯ НОЧ.
ПАЕСЦІ?!
ЗАРАЗ БУДЗЕ, ХЛОПЦЫ!
ПАСПРАБУЮ ЗДАГАДАЦЦА – У ВАС, РАБЯТЫ, НА СНЕДАННЕ БУДЗЕ ПІЦЦА.


БОЖА, УЖО РАНІЦА! МНЕ ТАКСАМА ЧАС ІСЦІ – У МЯНЕ СУР'ЁЗНЫ ІСПЫТ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ГАДЗІН.
Я З ТАБОЙ, ЭЙПРЫЛ.
ДЗЯКУЙ.
ПОСПЕХАЎ, РАБЯТЫ. ЯК ТОЛЬКІ Я БУДУ ВОЛЬНАЯ, Я ПРЫЙДУ ВАС АДВЕДАЦЬ. МОЖАЦЕ ЗАСТАВАЦЦА ТУТ СКОЛЬКІ ВАМ ЗАЎГОДНА, ДАМОВІЛІСЯ?
ЯШЧЭ РАЗ ДЗЯКУЙ, ЭЙПРЫЛ
ЛІЧЫШ, УСЁ БУДЗЕ ДОБРА, КЕЙСІ?
АГА... НЕ ТУРБУЙСЯ. ГЭТА БЫЛО ФАЙНА З ТВАЙГО БОКУ, ПАКІНУЦЬ ІМ ГЭТАЕ МЕСЦА. ХУТКА ЯНЫ ЗНОЎ ВЕРНУЦЦА ДА ЛАДУ, ВОСЬ УБАЧЫШ.
ГЭТЫЯ ХЛОПЦЫ...
...ВЕДАЮЦЬ, ЯК ВЫЖЫЦЬ.
ХММ. НОВЫЯ СУСЕДЗІ, ГА?


МОЙ СУПЕРНІК ЛЯЖЫЦЬ ЗРЫНУТЫ ЛЯ МАІХ НОГ.
ПРАГНЕ ЛІТАСЦІ.
І, СКРОЗЬ УВЕСЬ ШУМ, СКРОЗЬ УСЮ НАПРУЖАННАСЦЬ, ЯКАЯ НАПАЎНЯЕ ГЭТЫ ПАКОЙ, ПРАБІВАЕЦЦА МЕНАВІТА ГЭТАЕ СЛОВА, ЯК У МАЁЙ ГАЛАВЕ... ТАК І Ў СЭРЦЫ.
ЛІТАСЦІ.
Я ПЕРАМОГ, АЛЕ, КАЛІ Я ЗДЗЕЙСНЮ БЯЗЛІТАСНЫ ЎДАР, ЯКОГА АД МЯНЕ ТАК ЧАКАЮЦЬ...
У ЧЫМ СПРАВА, ГРЫЗУН? ТЫ ПРАЙШОЎ ІСПЫТ. ЗАБІ Ж ЯГО І ДАЛУЧАЙСЯ ДА НАС!
...ТАДЫ Я ПРАЙГРАЮ.
НЕ. Я АДМАЎЛЯЮСЯ ЗАБІВАЦЬ ЯГО.
ДУРАНЬ! МАЙСТАР ШРЭДАР ЗАГАДВАЕ ТАБЕ ЗРАБІЦЬ ГЭТА! НЯЎЖО ТЫ НЕ РАЗУМЕЕШ, ЯКІЯ НАСТУПСТВЫ МОЖА ПАЦЯГНУЦЬ ТВАЁ НЕПАДПАРАДКАВАННЕ?!


ТАК, ЮНАЯ ЛЕДЗІ, Я ЦУДОЎНА РАЗУМЕЮ, ЗА ШТО ТУТ ІДЗЕ БОЙКА. ЗА ГОНАР.
ЗА МОЙ ГОНАР.
Я ШМАТ ЧАГО ВЕДАЮ ПРА КЛАН «ФУТ»... НАВАТ БОЛЬШ, ЧЫМ ВЫ МОЖАЦЕ САБЕ ЎЯВІЦЬ.
ГАЛОЎНАЕ, ШТО КАЛІСЬЦІ ГЭТА БЫЎ СУМЛЕННЫ КЛАН, АЛЕ ЗАРАЗ ІНШЫ ЧАС.
ЯГО ГОНАР БЫЎ АПАГАНЕНЫ ЗНУТРЫ ІНШЫМ ВАЯРОМ, ПАДОБНЫМ ТАБЕ. ЁН ТАКСАМА СТАВІЎ УЛАДУ ВЫШЭЙ ЗА ЎСЁ – ТАТАЛЬНАЕ ДАМІНАВАННЕ ЗА ЛЮБЫ КОШТ.
І, ЯК ТЫ, ЁН ПАМЫЛЯЎСЯ.
НАХАБНЫ ЧАРВЯК! ЯК ТЫ АСМЕЛІЎСЯ ЗВЯРТАЦЦА ДА МАЙСТРА ШРЭДАРА З ТАКОЙ ПАГАРДАЙ?! Я АДРЭЖУ ТАБЕ ЯЗЫК!
Я НЕ ГАТОВЫ АДДАЦЬ НІ СВОЙ ЯЗЫК, НІ СВАЁ ЖЫЦЦЁ, АЛЕ ГАТОВЫ ЗМАГАЦЦА ЗА ІХ. Я ЛЕПШ ЗАГІНУ, ЧЫМ ДАЛУЧУСЯ ДА ВАС І ЗГУБЛЮ СВОЙ ГОНАР.
ВЫ АПАГАНІЛІ ГОНАР КЛАНА...
...І Я НЕ БУДУ ПРЫМАЦЬ УДЗЕЛ У ГЭТЫМ ЖАХУ!
НЕ... НЕ МОЖА БЫЦЬ.


ХАМАТА ЁШЫ?
ЯГО ГОЛАС, БЫЦЦАМ ДЭМАНІЧНЫ ШЭПТ ПА-ЗА ЧАСАМ І ПРАСТОРАЙ. БЫЦЦАМ З ТРУНЫ.
АРОКУ САКІ?
НАРЭШЦЕ, МАЕ СУМНЕННІ АДКІНУТЫ ПРЭЧ. МОЙ СТАРАЖЫТНЫ ВОРАГ І САПРАЎДЫ ВЯРНУЎСЯ. ЖЫВЫ...
...І ВОСЬ ЁН.
ТАК. ГЭТА Я.
Я Б СПЫТАЎ, ЯК ТЫ ТУТ АКАЗАЎСЯ, ХАМАТА ЁШЫ, І ЧАМУ ТЫ ТАК ВЫГЛЯДАЕШ, АЛЕ Я ВЯРНУЎСЯ Ў СВЕТ ЖЫВЫХ ПАСЛЯ СТОЛЬКІХ ГАДОЎ НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ МАРНАВАЦЬ КАШТОЎНЫ ЧАС НА ТАКІЯ ГЛУПСТВЫ.
КАРАІ...


...ЗАБІ ЯГО.
ПРАЦЯГ БУДЗЕ...